

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№12(148)

15 чэрвеня 2015 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІЛЬГОТЫ ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНІМ РАЁНАМ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

8 чэрвеня Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №235 "Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёну Магілёўскай вобласці". Падрабязнасці ў матэрыяле Еўрарадыё.



Як паведамляе БелаПАН, указ закранае Клімавіцкі, Касцюковіцкі, Краснапольскі, Крычаўскі, Слаўгарадскі, Хоцімскі і Чэрыкаўскі раёны. Для іх устойлівага развіцця даюцца прэферэнцыі.

Так, фізічным асобам даецца льгота па выплаце падаходнага падатку. Для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія зарэгіструюцца ў рэгіёне з 1 ліпеня 2015-га па 31 снежня 2020 года і будуць займацца тут вытворчасцю тавараў (выкананнем работ, аказаннем паслуг) на працягу сямі гадоў з пачатку такой дзейнасці, устанаўліваецца стаўка ў 10% з даходаў у выглядзе аплаты працы, атрыманых па працоўных дагаворах (кантрактах).

Наймальнікам і камерцыйным арганізацыям, якія зарэгіструюцца з 1 ліпеня 2015 па 31 снежня 2020 года і на працягу сямі гадоў будуць займацца тут вытворчасцю тавараў (выкананнем работ, аказаннем паслуг), указ дае льготы па абавязковых страхавых узносах па страхаванні выпадкаў дасягнення пенсіённага ўзросту, інваліднасці і страты кармільца. Такія страхавыя ўзносы ўстанаўліваюцца ў памеры 24%.

Пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або куплі жытла ў гэтых раёнах можна будзе атрымаць ільготныя крэдыты на 20 гадоў пад 1% гадавых. Пры гэтым неабходна працаваць на тэрыторыі рэгіёну не менш за 10 гадоў з моманту атрымання такіх крэдытаў.

Магілёўскі абласны савет дэпутатаў да 1 жніўня 2015 года павінен будзе зацвердзіць праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёну Магілёўскай вобласці на перыяд да 2020 года. Агульны аб'ём фінансавання мерапрыемстваў праграмы складае 2,5 трыльёна рублёў.

Указ набывае моц 1 ліпеня.


КАМЕНТАР У ТЭМУ:

Эканамічны аглядальнік незалежнай газеты з Крычава «Вольны горад» Арцём Сямёнаў скептычна ставіцца да таго, што ільготы для паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны дадуць штуршок ягонаму развіццю. Для Радыё Свабода эксперт адзначыў: добра, што на гэтыя тэрыторыі звярнулі ўвагу. Аднак, на ягоную думку, мала што цяпер можа змяніць сітуацыю да лепшага. Страчаны і час, і кваліфікаваныя кадры.

«Наагул варта мяняць усю сістэму падыходу да кіравання эканомікай, — лічыць Арцём Сямёнаў. — Гэтым павінны займацца граматныя кадры, якія хочуць нешта змяніць. А тут — адны часовыя „ўпраўленцы“, якія прыехалі ды з’ехалі. Ніводзін кіраўнік раёнаў не застаўся тут жыць. Усе некуды паўцякалі. Можа, варта было б тут сапраўды рэалізаваць на практыцы канстытуцыйнае права роўнасці ўсіх формаў уласнасці перад законам? Мо гэта б дапамагло?»

Свае довады Арцём Сямёнаў падмацоўвае прыкладамі неэфектыўнага ажыццяўлення іншых праграмаў, якія меліся стымуляваць эканамічнае развіццё.

«Паглядзіце, гадоў пяць таму ўрад прымаў дзяржаўную праграму па развіцці малых гарадоў. Прынялі яе. І што? Ды нічога. Паглядзіце, што стала з праграмай адраджэння сяла. На яе рэалізацыю кінутыя каласальныя грошы. І што змянілася? Нічога. Па вялікім рахунку, сітуацыя толькі пагоршылася. Грошы ўклалі, а аддачы няма».



ПОЧЕМУ ХОТИМСКУ ДАЮТ ЛЬГОТЫ, А ДРОГИЧИНУ — НЕТ?

Алесь ПИЛЕЦКИЙ, Еврорадио

При этом по средней зарплате, количеству убыточных предприятий и безработным эти районы почти не отличаются.

8 июня глава страны подписывает указ №235 «О социально-экономическом развитии юго-восточного региона Могилёвской области». С 1 июля семь районов получат неслабые бонусы.

КТО

Климовичский, Костюковичский, Краснопольский, Кричевский, Славгородский, Хотимский и Чериковский районы. Всего там проживает около 130 тысяч человек.

ЧТО ПОЛУЧИЛИ

Льготы. Подоходный налог в размере 10% (как у программистов из нашей «силиконовой долины») до конца 2020 года. Коммерческие фирмы и предприниматели — 24% выплаты в Фонд социальной защиты населения (вместо 30% по всей стране). И (самое бешеное предложение) кредит на строительство и реконструкцию жилья на 20 лет под... 1% (один!). Правда, после получения кредита нужно будет прожить в регионе не менее 10 лет. Но чего не сделаешь, когда хочется свой дом получить. Тем более почти задаром. За десять лет инфляция от полученной в кредит суммы оставит только рожки да ножки. Разве что, чудо экономическое случится.

КАКИЕ ЗАРПЛАТЫ

Вот что сообщает сайт Белстата, где ещё можно узнать правду. Из всех одаренных льготами районов самая высокая средняя зарплата в Костюковичском — 5 миллионов 339 тысяч (данные за январь-апрель 2015 год). Самая низкая — в Славгородском, там люди за месяц работы получают около 4 миллионов 416 тысяч. В других районах «юго-востока» зарплата — 4,4-5 миллиона. То есть средняя по региону — около 4,7 миллиона. Не много, что скрывать. Особенно если с Минском сравнивать.

КАКИЕ ПРЕДПРИЯТИЯ

Снова Белстат. Если ему верить, то в январе-апреле близкая к катастрофе ситуация наблюдалась в Хотимском районе. Здесь целых 30,8% предприятий были убыточными. В других районах намного лучше: Климовичский — 3,7%, Славгородский — 10,5%, Чериковский — 6,7%. Ну и так далее.

БЕЗРАБОТИЦА

С ней, как и повсюду в стране, почти фантастика. В Климовичским, Краснопольском и Славгородском районах самая большая — 1,3%. В Хотимском — около 0,5%. В причинах белорусского рабочего феномена разбираться не будем, но работы в льготном регионе хватает всем.

СРАВНИМ С ДРУГИМИ

И это на самом деле самое интересное! Открываю тот же статистический бюллетень «Регионы Беларуси». Белстат, Минск, май 2015. Тыкаю пальцем в Ивановский район Брестской области и имею: средняя зарплата 4,8 миллиона, количество убыточных предприятий — 18,8%, безработица — 1,3%. Смотрю статистику Дрогичина — там тоже все цифры для президентского указа: зарплата — 4,5 миллиона, количество убыточных предприятий — 23,5%, безработица — 0,9%. После Ганцевичей (4,4 миллиона, 17,4% и 1,5% соответственно) смотреть статистику по Витебской, либо Гомельской областям желание пропадает.

«КОНЕЧНО, НУЖЕН!»

В отделе идеологии Чериковского райисполкома объяснили, что Могилёвский облисполком уже разработал план мероприятий программы — всё под контролем. «Мы всё же пострадали от Чернобыльской трагедии, это не лишняя программа для нас... Возможно, молодёжь будет оставаться жить в районе, а не уедет. Здесь станет дешевле. Это очень хорошо. Возможно, люди начнут приезжать жить к нам», — рассказывают Еврорадио.

Конечно, начнут. Особенно охотно из Ганцевичей или Дорогичина, где, если верить Белстату, и зарплаты меньше, и радиационное загрязнения, на удивление, тоже есть.

СКОЛЬКО ВСЁ СЧАСТЬЕ СТОИТ

Точных цифр, сколько бюджету будут стоить льготы для юго-восточных районов Могилёвщины, нет. БелТА называет что-то около 2 триллионов 520 миллиардов — почти 170 миллионов долларов по курсу начала июня. Ерунда, можно и скинуться.





БЫВШИЙ ПРИЁМНЫЙ СЫН ИРИНЫ МОЦНОЙ ПОКОНЧИЛ С СОБОЙ

Бывший приёмный сын Ирины Моцной Александр Пугачёв покончил с собой. Эту информацию подтвердила TUT.BY его сестра Кристина. По словам девушки, молодой человек повесился в прошлое воскресенье, 7 июня.

Кристина рассказывает, что узнала о смерти брата в понедельник днём. Хоронили его в среду 10 июня, в Климовичах. Похоронами занималась администрация Минского высшего радиотехнического колледжа, в котором учился Саша. Детали трагедии девушке неизвестны.

Управлением Следственного комитета по городу Минску проводится доследственная проверка по факту смерти Александра Пугачёва. Об этом сообщила TUT.BY официальный представитель СК Юлия Гончарова.

«Тело молодого человека было обнаружено в комнате общежития, в котором он проживал. На место выбывала следственно-оперативная группа. Первоначальные проверочные мероприятия позволяют сделать вывод, что это суицид. В настоящее время назначена судебно-медицинская экспертиза, проводятся проверочные мероприятия», — рассказали в Следственном комитете.

17-летний Саша Пугачёв — один из приёмных детей Ирины Моцной, жил в её семье шесть лет.

Летом 2014 года у родителя-воспитателя из Климовичей Ирины Моцной забрали шестерых приёмных детей после самоубийства её мужа Виктора. Вскоре на бывшую приёмную мать завели уголовное дело, обвинив её в злоупотреблении правами опекуна, ограничении личной свободы и истязании малолетних. Суд признал Ирину Моцную виновной и приговорил её к 4 годам колонии.

НОВОСТИ РЕГИОНА

ЮБИЛЕЙ МАСТЕРА

11 июня исполнилось 50 лет со дня рождения известного климовичского художника Александра Котова. Наш земляк родился в деревне Лобжа Климовичского района. Всю свою жизнь он посвятил служению творчеству, работая в различных жанрах искусства, а также возглавляя районный Дом ремёсел. В 2011 году А.В. Котов был принят в Союз мастеров Беларуси, ему присвоено звание «Народный мастер». Поздравляем и желаем покорения ещё многих творческих вершин!

НЕТ ПОРЯДКА НА ЗЕМЛЕ

Благоустройство и использование земельных участков находится под пристальным вниманием государства. Как это происходит, рассказала «Могилёвским ведомостям» Ирина Петрученя, возглавляющая землеустроительную службу облисполкома. Среди прочего она сообщила: «В населённых пунктах Климовичского, Костюковичского и некоторых других районов есть чистые площади по 3–5 и более гектаров, которые остаются нераспаханными, не вовлечёнными в сельскохозяйственный оборот». Также по её словам, в деревнях этих районов слабо занимаются наведением порядка на земле.

ТУРСЛЁТ ПЕДАГОГОВ

В конце мая на берегу реки Березина (Бобруйский район) состоялся XV профсоюзный турслёт педагогических работников области. На протяжении трёх дней 20 команд состязались в технике пешеходного туризма, спортивном ориентировании, туристской эстафете. Соревнования состояли из спортивной и конкурсной программы. В конкурсе представления команд педагоги Климовичского района заняли 2-е почётное место. Общекомандные места распределились следующим образом: 1-е место – команда Могилёва, 2-е – Шкловского района, 3-е – Климовичского района. Победители награждены памятными призами.

АНОНС:




СТРАУС НА ПЛЕМЯ

Портал TUT.BY разместил интересный материал о разведении страусов в Беларуси. В нём отмечается, что в Климовичском районе находится самая крупная в стране страусиная ферма. Как рассказали в отделе сбыта агрокомбината «Приднепровский», мясо страуса реализуют по цене 160-170 тыс. руб. за килограмм, фарш стоит 100 тыс. рублей, а вот яйцо оценивают в 210 тыс. руб. В отделе сбыта пояснили, что продают яиц мало, так как хозяйство единственное в стране, где занимаются племенным разведением страусов. А вот приобрести подросших птенцов и взрослых птиц – пожалуйста.

ДОИТЬ И ПРОДАВАТЬ

Начальник управления образования облисполкома Владимир Рыжков в интервью «Могилёвским ведомостям» рассказал о системе профтехобразования области. Он сообщил, что для преодоления непривлекательных стереотипов отдельных профессий сельскохозяйственного профиля «мы их интегрируем с другими». И теперь в дипломе выпускника значится, что он не только оператор машинного доения, но ещё и тракторист или слесарь по ремонту машин и оборудования. А, например, в Климовичском лицее оператор машинного доения совмещён с профессией продавца.



А ПА ТЭЛЕВІЗАРЫ ЎСЁ ДОБРА

Іван БАРЫСАЎ

Паводле дадзеных Белстата, амаль усе асноўныя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі Беларусі ў студзені-красавіку 2015 года дэманструюць падзенне. І гэта яшчэ вельмі мякка сказана, бо фактычна эканоміка Беларусі ўвайшла ў крутое піке.



Так, ВУП нашай краіны ў параўнанні з аналагічным перыядам 2014 года ўпаў на 2,6%, прадукцыйнасць працы — на 1,1%. Вытворчасць прамысловай прадукцыі знізілася на 7,5%, інвестыцыі ў асноўны капітал — на 5,9%, грузаабарот — на 5,2%, таваразварот грамадскага харчавання — на 10,4%.

Спажывецкія цэны выраслі на 16,4%. Пры гэтым на прамысловую прадукцыю цэны выраслі на 17,5%, на сельскагаспадарчую прадукцыю — на 11,7%, а ў сферы будаўніцтва — на 14,7%.

Сумарная завінавачанасць прадпрыемстваў за год вырасла на 31,9%. Аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў 1-м квартале ўпаў на 30,7%.

Намінальная заработная плата беларусаў вырасла на 13,1%, аднак рэальная знізілася на 4,2%.

Колькасць працаўнікоў, пераведзеных на няпоўны працоўны дзень, у сакавіку 2015 года ў параўнанні з сакавіком 2014 г. павялічылася ў 5,5 разу.

Колькасць працаўнікоў, адпраўленых у адпачынак без захавання заработнай платы альбо з частковай яе выплатай, узрасло ў 2,8 разу.

Аднак па беларускім тэлебачанні пра сумныя вынікі працы нашага нязменнага кіраўніка і яго верных чыноўнікаў чамусьці асабліва казаць не хочуць. Затое там цэлымі гадзінамі распавядаюць казкі пра тое, колькі "дармавых" грошай дасць нам у крэдыт братэрскі Кітай і як мы пасля гэтага слаўна зажывём.

Паверце мне на слова – "трындзяць", канешне. Браты-кітайцы даюць свае грошы толькі для таго, каб мы закупілі на іх "якасныя" кітайскія тавары і абсталяванне (жывы прыклад такога "плённага" супрацоўніцтва – крухмальны завод у Цяхціне ў нашым раёне, ці цэментны завод у Крычаве), ну а нам і нашым дзецям з унукамі застанецца даўгі, якія ўсё роўна ў любым выпадку патрэбна будзе плаціць.

Але Рыгоравіча і яго каманду гэта не вельмі хвалюе. Ім бы пратрымацца да чарговых "выбараў", ну а там пасля калі нешта і ляснецца, то цярплівы беларускі народ скажа "можа, так і трэба".

Ну а пакуль, паважаныя чытачы, уважліва слухайце выказванні Аляксандра Рыгоравіча, накшталт гэтага: «Мы будем сохранять трудовые коллективы, но поддерживать будем только тех, кто хочет работать. Впереди ещё более мощная конкуренция. Поэтому разгильдяям, тунеядцам, алкоголикам и проходимцам в трудовых коллективах делать нечего». Менавіта так наш нязменны кіраўнік выказаўся 15 траўня на сустрэчы з працаўнікамі МТЗ.

Ну і рыхтуйцеся да звальненняў, бо, чамусьці, чыноўнікі ў нас заўсёды вельмі добрыя, ну а рабацягі — спрэч «разгільдзяі, дармаеды і алкаголікі»...

ВЛАСТИ ЗАПЕЛИ ДЛЯ ДЕТЕЙ И ВНУКОВ НОВУЮ ПЕСЕНКУ

Светлана МЕТЁЛКИНА, Салідарнасць

Неожиданное заявление сделал первый замминистра финансов Максим Ермолович. Оказывается, внешние заимствования Беларуси будут способствовать повышению качества жизни будущих поколений.

Примечательно, что ещё каких-то 14 лет назад Александр Лукашенко заботу о детях и внуках видел несколько иначе.

Выступая в далёком 2001 году на Втором всебелорусском собрании, Лукашенко хвастался: «Мы не разбазарили народное достояние, не нахватались иностранных займов, не влезли в долги, отдавать которые пришлось бы детям и внукам!»

Не прошло и 15 лет, как "жизнь в долг" стала не только нормой, но и преподносится как огромное благо для будущих поколений.

— Это вполне нормально, поэтому для того, чтобы социальная инфраструктура развивалась, в том числе и для повышения качества жизни будущих поколений, государство должно заимствовать, — заявил первый замминистра финансов Максим Ермолович на расширенном заседании Постоянной комиссии Палаты представителей по бюджету и финансам.

О да! Родиться с долгом в 4 тысячи долларов (а именно 4,225 долларов сегодня должен каждый белорус) — это очень повышает твоё «качество жизни»! Причём, надо заметить, с каждым годом жизнь белорусов становится всё «качественнее». Только за последние пять лет долги эти выросли аж в два раза. А с 1996 по 2015 год внешний долг Беларуси на душу населения — в 28 раз!

И, судя по всему, останавливаться на достигнутом власти не собираются. Чего ни сделаешь для счастья будущих поколений!



«ПЛАНЫ У НАС ДОСТАТОЧНО АМБИЦИОЗНЫЕ…»

Если они сбудутся, то юго-восток Могилёвщины ожидают льготы и преференции

Александр ВЛАД

Ещё в прошлом году Могилёвский облисполком начал готовить программу социально-экономического развития юго-восточных районов области до 2020 года. Разработать такую программу поручили весной 2014-го, когда Александр Лукашенко посетил с рабочим визитом ряд регионов Могилёвщины. Напомним, что тогда было заявлено, что юго-восток области нуждается в целенаправленной помощи для обеспечения на этих территориях экономического роста и эффективного социального развития.



Чтобы стимулировать социально-экономическое развитие этих районов и была разработана соответствующая программа действий, которая рассчитана до 2020 года. Как объявил в апреле этого года председатель облисполкома Владимир Доманевский: «Планы у нас достаточно амбициозные, и мы надеемся, что они будут поддержаны правительством страны». Районы юго-востока Могилёвщины «по поручению главы государства должны подтянуть до уровня самых передовых в Беларуси».

И вот 8 июня Александр Лукашенко подписал Указ №235 «О социально-экономическом развитии юго-восточного региона Могилёвской области». Документ принят в целях устойчивого развития семи вышеупомянутых районов. Для этого Указ предусматривает создание необходимых условий и некоторых преференций. Общий объём финансирования мероприятий программы составляет 2 триллиона 520 миллиардов рублей, или почти 170 миллионов долларов по курсу на начало июня.

Не будем подробно останавливаться на перечислении положений данного документа. О том, какие налоговые и иные льготы он предоставляет, сообщили практически все государственные СМИ. На наш взгляд, гораздо полезнее ознакомиться с комментариями и оценками независимых экспертов, высказавших мнение после обнародования Указа №235. Сразу отметим, что в целом они довольно скептично оценили перспективы ожидаемого «устойчивого развития».

Так, известный эксперт-экономист, автор восьми книг и множества публикаций Ярослав Романчук подчёркивает, что принятием такого Указа «глава страны впервые признал районы экономического бедствия» (материал «Беларусь пошла пятнами» на портале NAVINY.BY). По сути, это свидетельство краха всей предыдущей социально-экономической политики. Но и это не самое плохое. По мнению Романчука, «предложенный набор налоговых и жилищных льгот едва ли в состоянии повлиять на решение тех, кто решил уехать, не уезжать». Зато «с высокой степенью вероятности льготами по указу № 235 воспользуется местная VIP-номенклатура, а также их коммерческие партнёры». И в итоге «нужные люди за счёт налогоплательщиков построят себе хоромы и поправят своё материальное положение». А эти и подобные им другие регионы Беларуси будут всё больше будут скатываться в статус зон социально-экономического бедствия.

Кстати, недавно климовичская районная газета «Родная ніва» назвала цифры, которые подтверждают сделанный Ярославом Романчуком вывод. По состоянию на 1 января текущего года в Климовичском районе расположен 141 сельский населенный пункт. В 54 деревнях проживают до 10 человек. Всего же в сельских населенных пунктах насчитывается 4999 домовладений, из них 3722 — заселено, 1277 жилых домов, т. е. 25,5% от общего количества, признаны пустующими.

Своё мнение высказала и Ирина Крылович, авторитетный экономический аналитик, редактор онлайн-издания «Белрынок» (публикация «Семеро с шапкой, или Белорусская модель в миниатюрах»). Принятый Указ даёт «не Бог весть какие льготы, поэтому вряд ли можно говорить о том, что они помогут этим районам выйти на устойчивое развитие, скорее, речь может идти о предотвращении возможной деградации». Ирина Крылович охарактеризовала положение районов, отметив по поводу Климовичского: «Большие просроченные долги — самая высокая просрочка по кредитам и займам (вероятно, брали на свиней)… Район — второй по объёмам промпроизводства из всех семи регионов, но при этом здесь самые высокие запасы готовой продукции…».

А, например, «Комсомольская правда в Белоруссии», сообщая о налоговых и жилищных льготах для юго-востока Могилёвщины, не преминула заметить, что в этих районах в 102-х населённых пунктах есть превышение уровня радиации. То есть, люди, которые поедут в обозначенные семь районов, чтобы воспользоваться льготами и кредитами, не должны забывать о том, что там существует превышение норм по загрязнению радиацией. Так что придётся делать выбор между льготным жильём и личным здоровьем.

На ряд нестыковок Указа обратил внимание журналист Еврорадио Алесь Пилецкий. На его вопросы в отделе идеологии Чериковского райисполкома объяснили, что всё под контролем, Могилёвский облисполком уже разработал план мероприятий программы: «Мы всё же пострадали от Чернобыльской трагедии, это не лишняя программа для нас... Возможно, молодёжь будет оставаться жить в районе, а не уедет. Здесь станет дешевле. Это очень хорошо. Возможно, люди начнут приезжать жить к нам».

Что ж, надеяться никогда не поздно, ведь надежда, как известно, умирает последней. Правда, уже тысячелетия назад древнегреческие мыслители Аристотель и Платон провидчески предупреждали о том, что человеческие надежды — это сон наяву. И проснуться одному ли человеку или всему обществу рано или поздно всё равно придётся. Чтобы наконецто задуматься и понять свою жизнь, прожитые годы, свои и чьи-то амбициозные планы, и многое-многое другое, что удастся вспомнить…



DALONI АД КЛІМАВІЦКАГА КАМБІНАТА ХЛЕБАПРАДУКТАЎ

Ясь ГАСПАДАР

У мінулым нумары нашага выдання паведамлялася аб тым, што Клімавіцкі камбінат хлебапрадуктаў абраў сабе брэнд з мілагучнай назвай DALONI. Прыемна адзначыць, што гэтая навіна прыцягнула ўвагу і іншых журналістаў. Звесткі пра беларускамоўны брэнд КХП з'явіліся ў інфармацыйных паведамленнях самых розных СМІ.

Так, Радыё Свабода падкрэсліла цікавую акалічнасць, што брэнд кампаніі «Daloni» ня толькі беларускамоўны, але і выкананы беларускай лацінкай. Да таго ж новая гандлёвая марка Клімавіцкага камбінату хлебапрадуктаў мае афармленне ў белых і чырвоных колерах, якія здаўна ўспрымаюцца як нацыянальныя колеры беларусаў.

Пад гэтым брэндам будуць прадаваць муку, камбікорм, крупы, рапсавы алей, мучныя паўфабрыкаты. «Уся прадукцыя, якую выпускае наш камбінат, робіцца нашымі рукамі, таму слова «Далоні» найбольш пасуе нашаму брэнду. У ім цеплыня і любоў, з якой мы вырабляем нашу прадукцыю», — патлумачыла выбар назвы брэнду начальнік аддзелу маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці прадпрыемства Святлана Каратцова.

«Слова «Далоні» сугучнае і з італьянскімі словамі, і шыкоўна гучыць на беларускай мове. Гэта слова аб'ёмнае, і яго можна па-рознаму тлумачыць, — дадае суразмоўніца. — Мы — вялікае прадпрыемства і вырабляем не толькі муку, але, апошнім часам, шмат увагі надаём харчовым канцэнтратам. Цалкам верагодна, што мы будзем ісці гэтай дарогай і далей. Невядома, на якія новыя рынкі мы выйдзем. Мо, неўзабаве, не італьянскія спагеці будзем есці, а свае вырабляць».

Паводле суразмоўніцы, асноўны рынак збыту прадукцыі камбінату — расійскі. Нямала яе прадаюць ва Украіне. Ёсць пастаўкі і ў краіны Еўразвязу. Зараз, як прызнае Святлана Каратцова, у асартыменце прадукцыі прадпрыемства пакуль няма беларускамоўных назваў, але над гэтым пытаннем ужо думаюць. А менавіта брэнд DALONI для камбіната распрацавала мінская фірма Public Group (фота брэнда ўзята з сайта фірмы pgr.by). Наапошак трэба адзначыць, што працэс рэгістрацыі новай гандлёвай маркі доўгі, і могуць быць розныя нечаканасці. Але будзем спадзявацца, што DALONI будуць мець добрыя перспектывы.



ДАРЭЧЫ:

З'яўленне беларускамоўнага брэнду КХП паказвае добры прыклад астатнім прадпрыемствам і арганізацыям Клімаўшчыны. Мы даўно звыкліся з тым, што на большасці дзяржаўных устаноў як у нашым горадзе, так і па ўсёй краіне амаль паўсюль бачым рускамоўныя шыльды і шыльдачкі. Але Клімавічы ўсё ж знаходзяцца на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, а не Бранскай ці Смаленскай. Сёння ў горадзе можна сустрэць беларускамоўныя шыльды "Белпошта", "Дзіцячая раённая бібліятэка", "Магілёўсаюздрук", але іх магло быць і болей. Напрыклад, на чыгуначным вакзале ўвогуле ўсе шыльды і расклад руху цягнікоў напісаны па-беларуску. І няўжо гэта камусьці замінае? Наадварот, кожнаму адразу бачна, што ты прыехаў у Беларусь. Незалежную і самастойную краіну са сваёй мовай, сваіміназвамі, сваёй будучыняй.

ЗАГРОМОЖДЕНИЕ БАЛКОНОВ И ЛОДЖИЙ БУДЕТ НАКАЗЫВАТЬСЯ ШТРАФОМ ДО 5,4 МЛН. ДЛЯ ФИЗЛИЦ, ДО 9 МЛН. — ДЛЯ ЮРЛИЦ

Юлиана ШУПЛЕЦОВА, mogilevnews.by

26 мая 2015 года вступило в силу постановление СовМина Республики Беларусь № 446. Им предусмотрено наложение запрета на загромождение балконов и лоджий собственниками, нанимателями жилых помещений, а также хранения в таких помещения легковоспламеняющихся, взрывоопасных, загрязняющих воздух веществ.

— Содержание балконов и лоджий должно соответствовать требованиям противопожарной безопасности и эксплуатационной надёжности, — прокомментировала начальник отдела эксплуатации жилфонда управления ЖКХ Могилёвского облисполкома Татьяна Тихановская . – В первую очередь, это в интересах безопасности самих граждан. Дважды в год, весной и осенью, мастера ЖЭУ проводят осмотр конструкций жилых домов, один раз в год – поквартирное обследование.

При выявлении фактов загромождений, представляющих опасность для конструкции балкона или лоджии, а также пожарную опасность, мастерами будет составлен протокол и вынесено предписание об устранении данного нарушения. Жильцы же обязаны предоставить беспрепятственный доступ для обследования балконов и лоджий, т.к. они являются элементами конструкций помещения, ответственность за эксплуатацию которых лежит на предприятиях жилищно-коммунального хозяйства.

Напоминаем, что нарушение Правил пользования жилыми помещениями, содержания жилых и вспомогательных помещений влечет наложение штрафа в размере от 10 до 30 базовых величин (для физлиц), а на юридическое лицо — от 30 до 50 базовых величин.

ЛЬГОТЫ, ЯКІЯ АДМЯНІЛІ ВА УКРАІНЕ, НЯМА І Ў БЕЛАРУСІ

Ва Украіне пазбаўляюць права на бясплатны праезд ветэранаў, але бясплатна кормяць школьнікаў, у нас — наадварот

Зміцер ЛУКАШУК, Еўрарадыё

З 1 чэрвеня ва Украіне пазбавілі права на бясплатны праезд у грамадскім транспарце удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, "чарнобыльцаў", ветэранаў працы, ахвяр нацысцкіх злачынстваў. Гэта не застаецца па-за ўвагай беларускіх СМІ. Маўляў, як можна крыўдзіць гэтых людзей. А мы прапануем паглядзець, якія ільготы маюць беларускія ветэраны вайны, "чарнобыльцы" і "афганцы".



«ЧАРНОБЫЛЬЦЫ» І «АФГАНЦЫ»

У беларускіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны сітуацыя з ільготамі на праезд сапраўды лепшая — яны могуць ездзіць у грамадскім транспарце бясплатна. А вось нашы "чарнобыльцы" і "афганцы" пазбаўленыя гэтага права ажно ад… 2008 года!

«У Беларусі гэта было адменена ў 2008 годзе Указам прэзідэнта і праз закон, якія праходзіў праз парламент, — распавядае удзельнік вайны ў Афганістане, праваабаронца Алег Воўчак. — І тады не толькі "афганцы" трапілі пад той закон: і "чарнобыльцы" трапілі, і інваліды III групы — па стане здароўя, па ўзросце. Там вялікая катэгорыя ільгот была скарочаная».

Высвятляецца, што адначасова з праездам айчынных "чарнобыльцаў" і "афганцаў" пазбавілі ільготных рэцэптаў на лекі і бясплатнага пратэзавання. А што з астатнімі ільготамі ў гэтых і іншых катэгорыяў льготнікаў ва Украіне?

Па словах украінскага эксперта ў галіне грамадзянскіх правоў Барыса Кушнірука, ва Украіне ад 12 да 16 мільёнаў розных ільготнікаў — "афганцаў", "чарнобыльцаў" ды шэрагу іншых. Чаму такая недакладная лічба? Бо агульнадзяржаўнай базы льготнікаў у краіне не было — усе яны рэгістраваліся ў абласцях. Вядома, кажа суразмоўца Еўрарадыё, гэта стварала спрыяльныя ўмовы для карупцыі, калі любое пасведчанне можна было альбо набыць, альбо атрымаць "па знаёмстве". Ва ўмовах эканамічных цяжкасцяў улады вырашылі выдаткі на ільготы скараціць. Але не поўнай іх адменай, як у суседняй Беларусі.

«Падыход абралі крыху іншы: калі ў чалавека даход вышэйшы за пэўны ўзровень, а гэта да 3 мінімальных заробкаў, то яму тая ільгота не даецца. А калі меншы — тады ён на яе мае права. Без розніцы, хто той льготнік: "чарнобылец", "афганец", удзельнік баявых дзеянняў, шматдзетная сям'я ці яшчэ хто», — тлумачыць Барыс Кушнірук.

СПЕЦПЕНСІІ

А мінімальны заробак ва Украіне ад 1 студзеня 2015 года складае 1284 грыўні, альбо 905 тысяч 220 беларускіх рублёў. У той жа час усе ўкраінскія пенсіянеры маюць права на бясплатны праезд у гарадскім транспарце: метро, трамваях, аўтобусах, тралейбусах. А калі пенсіянер інвалід, то і ў маршрутках. У Беларусі ж усе пенсіянеры мусяць плаціць за праезд.

Дарэчы, ва Украіне адначасова з адменай бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце для ветэранаў адмянілі спецпенсіі.

Барыс Кушнірук: «З 1 чэрвеня адмененыя ільготы, звязаныя з так званымі спецпенсіямі. Пэўныя катэгорыі высокапастаўленых чыноўнікаў — пракурораў, суддзяў, іншых дзяржслужбоўцаў высокага ўзроўню — у іх пенсія была, якая магла дасягаць некалькіх дзесяткаў тысяч грыўняў у месяц. Пры тым, што сярэдняя пенсія ва Украіне — 1500 грыўняў (1 мільён 57 тысяч беларускіх рублёў — Еўрарадыё). Цяпер пенсія такіх спецпенсіянераў не можа перавышаць 7 мінімальных заробкаў».

Эканомія ад такога скарачэння спецпенсій, кажа Барыс Кушнірук, параўнальна невялікая ў грашах — 1,5 мільярда грыўняў у год, але вялізная, калі казаць пра сацыяльную справядлівасць.

КАРАЦЕЙ, НЕ ЎСЁ ТАК ПРОСТА

Што яшчэ можна сказаць пра льготы? Да прыкладу, у ваюючай Украіне і цяпер пакінулі бясплатнае харчаванне ў школах для ўсіх дзяцей з 1 па 4 клас. У беларускіх школах бясплатна кормяць толькі дзяцей са шматдзетных сем'яў. Калі вы вымушаныя плаціць за камунальныя паслугі больш за 15% агульнага даходу сям'і, то маеце права на атрыманне спецыяльнай "камунальнай" субсідыі ад дзяржавы. Вяртаць яе не трэба. Але калі падманеце, трапіце пад крымінальны артыкул.

І яшчэ, вяртаючыся да адабранага права на бясплатны праезд для ўкраінскіх ветэранаў вайны.

Барыс Кушнірук: «Калі прымалі бюджэт на 2015 год, то прапісалі, што самі рэгіёны могуць вызначыцца: можа, да прыкладу, кіеўскі бюджэт датаваць такіх льготнікаў — дае ім ільготу на праезд у транспарце. Няма ў рэгіёна такой магчымасці — выбачайце».

Карацей, з ільготамі не ўсё так проста не толькі ва Украіне. Іншая справа, што ў нас няма вайны, мы — "сацыяльна арыентаваная краіна" і ў нас, як упэўніваюць улады, няма моцнага эканамічнага крызісу…



ПАВЫШАЦЬ ПЕНСІІ ПАКУЛЬ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

Фінансавыя магчымасці не дазваляюць павышаць пенсіі. Аб гэтым абвесціла кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН).

Па звестках БелаПАН, пра гэта паведаміла кіруючая фондам Людміла Бачыла, выступаючы 8 чэрвеня на пашыраным пасяджэнні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах.

Яна адзначыла, што ў мінулым годзе працоўныя пенсіі павышаліся тройчы: на 5, 7 і 5,5 %. У гэтым жа годзе заработная плата не вырасла настолькі, каб можна было павысіць працоўныя пенсіі.

"Сітуацыя няпростая, пенсіянеры хочуць павышэння пенсій. Яны прывыклі да штоквартальнага пераразліку пенсій. Нажаль, фінансавыя магчымасці не дазваляюць гэта рабіць", — заявіла Бачыла.

На яе думку, у далейшым сітуацыя шмат у чым будзе залежаць ад таго, "як павядзе сябе сярэдні заробак". Кіраўнік ФСАН адзначыла, што пры наяўнасці магчымасцяў рашэнне аб пераразліку памеру працоўных пенсій можа быць прынятае. Пры гэтым Бачылы нагадала, што згодна з заканадаўствам пераразлік пенсій праводзіцца ў выпадку, калі сярэдняя зарплата за квартал вырасла больш чым на 15 %.



ПРЕДСЕДАТЕЛЬ БЕЛОРУССКОЙ АССОЦИАЦИИ ВРАЧЕЙ УБЕЖДЁН, ЧТО АЛКОГОЛЬНЫЕ КОЛЛЕКЦИИ СОБИРАЮТ ТЕ, КТО НЕ СТРАДАЕТ АЛКОГОЛИЗМОМ

Дискуссия о том, сколько алкоголя безнаказанно могут хранить у себя дома граждане Беларуси, из социальных сетей переместилась в парламентские кулуары. Об этом сообщает сайт sputnik.by.

Согласно статье 12.27 Кодекса об административных правонарушениях, гражданин имеет право хранить дома не более 15 литров спиртных напитков без документов, подтверждающих их легальное приобретение. За нарушение этой нормы предусмотрен штраф до ста базовых величин с конфискацией излишков алкоголя. В мае налоговые органы арестовали оштрафовали гомельчанина за хранение в своём жилище 178 бутылок дорогого алкоголя без документов, подтверждающих его приобретение. Спиртное, которое он получал в подарок от своих пациентов, было изъято.

Председатель Белорусской ассоциации врачей, член комиссии по охране здоровья, физической культуре, семейной и социальной политики Палаты представителей Дмитрий Шевцов считает, что норму о лимите хранящегося алкоголя у граждан нужно отменить.

«Сейчас уже настало время пересмотреть старое законодательство в отношении нормы хранящегося алкоголя у граждан. Вообще эту норму пора отменять», — заявил Шевцов журналистам в кулуарах овального зала.

«Мы ведь живем в цивилизованной стране и движемся вперед», — подчеркнул парламентарий. При этом он отметил, что эта норма не может быть направлена на профилактику и предупреждения пьянства и алкоголизма.

«Ведь кто хранит у себя алкоголь? Люди, которые им не злоупотребляют, а, скажем так, дегустируют, собирают коллекции элитного алкоголя», — отметил Шевцов. Он напомнил, что норма об ограничении была принята в 2007 году.


КИНОГЕРОИ АНДРЕЯ МИРОНОВА О ЛЮБВИ И ЖЕНЩИНАХ

Десять самых известных цитат из фильмов, где герои Миронова говорят о любви и о женщинах.

* 1. Руссо туристо облико морале.
* 2. Мне ухаживать некогда. Вы привлекательны. Я чертовски привлекателен. Чего зря время терять? В полночь. Жду.
* 3. Знойная женщина — мечта поэта
* 4. Тише, девушка! Женщину украшает скромность. К чему эти прыжки?
* 5. Вообще-то я сам могу, но гораздо приятнее, когда женщина гладит.
* 6. Жениться нужно на сироте!
* 7. Я думаю так, Пеппи: если женщина что-то просит, то ей надо непременно дать! Иначе она возьмёт сама!
* 8. Утрите Ваши глазки, гражданка. Каждая Ваша слезинка — это молекула в космосе.
* 9. Девушка, мы с вами рядом не лежали?
* 10. — А кто у нас муж?

— Волшебник.

— Предупреждать надо.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна